УДК 811.161.3‟42‟37:821.161.3-1*Л. Дранько-Майсюк

М. С. Шчалкун

Навук. кір. – А. А. Станкевіч, д-р філал. навук, прафесар

# СІНТАКСІЧНЫЯ СРОДКІ ЭКСПРЭСІЎНАСЦІ: ФІГУРЫ МАЎЛЕННЯ Ў ПАЭЗІІ ЛЕАНІДА ВАСІЛЬЕВІЧА ДРАНЬКО-МАЙСЮКА

У артыкуле на матэрыяле паэтычнай творчасці Л. В. ДранькоМайсюка аналізуюцца сінтаксічныя сродкі выяўленчай выразнасці – рытарычныя фігуры: рытарычныя воклічы, звароты і пытанні. Пры гэтым падаецца азначэнне рытарычных фігур, аналізуецца іх рытміка-інтанацыйнае афармленне, вызначаюцца структурна-семантычныя асаблівасці, раскрываецца функцыянальна-стылістычная роля ў паэтычным дыскурсе Л. В. Дранько-Майсюка.

Л. В. Дранько-Майсюк выкарыстоўвае ў сваіх паэтычных творах разнастайныя сінтаксічныя сродкі выяўленчай выразнасці, якія называюць фігурамі маўлення. Да фігур маўлення адносяцца таксама рытарычныя фігуры, адметныя сваѐй асаблівай інтанацыйнай аформленасцю: рытарычныя воклічы, звароты і пытанні, якія даволі папулярныя ў паэзіі не толькі Леаніда Васільевіча, але і іншых аўтараў. Языкознание 240 Рытарычны вокліч – гэта «сцвярджэнне пэўнага пытання ў эмацыянальнай форме» [1, с. 149]. Звычайна дадзеная рытарычная фігура ўяўляе сабой сказ, у канцы якога ставіцца клічнік. Пры чытанні рытарычны вокліч вылучаецца інтанацыйна. Дадзеная фігура ўзмацняе ў тэксце выражэнне тых ці іншых пачуццяў; рытарычны вокліч звычайна адрозніваецца не толькі асаблівай эмацыянальнасцю, але і ўрачыстасцю. З дапамогай выкарыстання гэтай рытарычнай фігуры аўтар дэманструе момант найвышэйшага напружання ўласных пачуццяў або эмоцый лірычнага героя твора, якое сімвалізуе вокліч ці нават выкрык. Прычым спектр пачуццяў надзвычай шырокі: гэта можа быць захапленне, здзіўленне, радасць, задавальненне, адабрэнне, крыўда, горыч, адчай, абурэнне У мастацкіх творах рытарычныя воклічы сустракаецца даволі часта. Яны недарэчныя хіба што ў навуковых тэкстах, дзе не выкарыстоўваецца эмацыйная ацэнка. Вылучаюцца два асаблівыя віды воклічаў – аганактэзіс і катаплака [5, с. 192; с. 231]. Першы ўяўляе сабой рытарычны вокліч, які выказвае абурэнне, бунт, смутак. Напрыклад, у вершах Леаніда Дранько-Майсюка: «Вядома ж, не… мне гэта ўсѐ здалося! Яшчэ ніякі гэта не разрыў! Яшчэ шуміць эгейскае калоссе, І кіфарыйскі спеліцца матыў» [3, с. 33]; «Патухла свечка летняя. Даволі! Адно прадонне і адзін зеніт. «Паэт не памыляецца ніколі», – Што ж, радуйся, самотны Леанід» [3, с. 51]. Катаплака – рытарычны вокліч ў выглядзе кароткай устаўкі з негатыўнай эматыўнай афарбоўкай [5, с. 192]. Такі від воклічу таксама можна сустрэць у вершах пісьменніка: «Даволі вярэдзіць раны! І без таго заўважаю – Глядзяць, як на эмігранта, На мяне, калі размаўляю» [2, с. 33]. «Рытарычны вокліч часта ўзмацняецца выкарыстаннем іншых сродкаў слоўнай вобразнасці: паўторам, метафарамі, параўнаннямі, эпітэтамі» [1, с. 149]. Напрыклад, у паэзіі Л. Дранько-Майсюка сустракаюцца варыянты ўзмацнення воклічу з дапамогай паўтору, эпітэта і метафары: «О, колькі кніг, о, колькі кніг! Яны – малыя і вялікія – 241 Не спеў, а толькі хрып і крык У параўнанні з тою кнігаю…» [2, с. 8]; «Не заўважаў цяжкой работы На гародах палескіх і палях, – Бо мне хацелася пяшчоты, Хацелася бачыць лілейны страх!» [3, с. 31]. У творах Леаніда Васільевіча часцей сустракаюцца такія эмоцыі, як прыкрасць, непрыемнасць ці абуральнасць. Вось як паэт перадае гэтыя настроі: «А на цябе спадзявацца даволі, Колькі было іх, пустых спадзяванняў! Ты аб сям‟і не забудзеш ніколі, Ты патануў у хвілінным каханні» [2, с. 61]. Трэба адзначыць, што аўтар выказвае не толькі негатыўныя пачуцці, у яго вершах прысутнічаюць таксама гонар і ўрачыстасць: «І ўсѐ ж ѐн пераможа Падманны рух і спех І спыніцца, дай Божа, Таму што – чалавек!» [2, с. 106]. Мы бачым, што з дапамогай рытарычнага воклічу можна адлюстраваць самыя розныя пачуцці. Нядзіўна, што гэтым прыѐмам карыстаўся і карыстаецца пісьменнік, каб надаць сваім творам прыгажосць і дынамічнасць. Рытарычны зварот – гэта фігура маўлення, якая складаецца са звароту да каго-небудзь ці чаго-небудзь для ўзмацнення выразнасці маўлення. Ён

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

служыць не столькі для называння адрасата маўлення, колькі для выражэння адносін да таго, пра што гаворыцца ў тэксце. Рытарычныя звароты могуць ствараць ўрачыстасць ці выказваць радасць, шкадаванне і іншыя адценні настрою і эмацыйнага стану [6, с. 84]. Важная рыса такога звароту – ўмоўнасць, якая выяўляецца ў тым, што адказваць на зварот неабавязкова. Галоўнае ў ім – не самі словы, а інтанацыя, з якой яны вымаўляюцца. Рытарычны зварот можа быць адрасаваны чалавеку, якому-небудзь паняццю, неадушаўлѐнаму прадмету. У тэксце зварот адасабляецца коскамі ці іншымі знакамі прыпынку. Зварот, як і рытарычны вокліч, распаўсюджаны ў паэтычнай творчасці Л. В. Дранько-Майсюка. Часцей за ўсѐ аўтар у паэзіі звяртаецца да асобнага чалавека, а не да сукупнасці асоб: «Багдановіч, даруй, Што ў цябе мы вучыліся мала – Языкознание 242 Мы да Коласа йшлі чарадой, Нас выводзіў у людзі Купала»[2, с. 29]; "Я пэўна праз цябе, Верлен!.. Пакуль жа На камяністым дне Яе саму, яе дзяцей і мужа Я бачу, як у сне» [3, с. 36]. Таксама ў шматлікіх вершах пісьменнік звяртаецца да абстрактных паняццяў тыпу жыццѐ, сон і інш.: «…Ах, сон! На вятрах-скразняках Нясеш ты праяву якую? Паволі ў наступных радках Цябе разгадаць паспрабую» [4, с. 33]; «О, Vita!.. На сардэчныя скрыжалі Запішацца і гэты покліч мой, – Так некалі паэты называлі Наіўны свой далагерны настрой» [3, с. 46]. Звяртаючыся да такіх адцягненых паняццяў, паэт як бы ажыўляе іх, робіць іх паўнавартаснымі спадарожнікамі і саўдзельнікамі свайго жыцця, падкрэслівае іх ролю ў сваім жыцці. Так верш становіцца больш выразным і адухоўленым. Рытарычны зварот сапраўды дазваляе зрабіць тэкст больш эмацыйным і жывым. Калі мы апусцім зварот у вершах аўтара, то разам з ім мы страцім аўтарскае стаўленне і пачуцці, звязаныя з адрасатам. Таму рытарычныя звароты не губляюць актуальнасці і часта выкарыстоўваюцца ў мастацкай мове Л. Дранько-Майсюка. Рытарычнае пытанне – гэта «пытанне, якое не патрабуе адказу, заключае ў сабе сцвярджэнне» [7, с. 135]. Рытарычнае пытанне, якое не патрабуе адказу, выкарыстоўваецца, каб узмацніць эмацыйнасць, выразнасць мовы. Задача фігуры – прыцягнуць увагу слухачоў або чытачоў да той ці іншай з�much"явы, прымусіць задумацца над праблемай і падштурхнуць іх да высновы. Зварот да аўдыторыі з рытарычным пытаннем – эфектыўны прыѐм. Ён ператварае маналог аўтара ў схаваны дыялог з аўдыторыяй, так як з яго дапамогай актывізуецца ўвага чытача. Прысутнасць рытарычнага пытання ў тэксце дапамагае адлюстраваць асабістыя перажыванні герояў, раскрыць іх унутраны свет. Амаль кожны пісьменнік у сваіх творах выкарыстоўвае гэтую рытарычную фігуру, каб узмацніць уражанне чытача, прымусіць яго паставіць 243 сябе на месца лірычнага героя, каб стварыць большую выразнасць і жвавасць у сваіх творах. Пад умоўна пытальнай інтанацыяй гэтай фігуры хаваецца неаднолькавы сэнс, усѐ залежыць ад сітуацыі і мэт, якія хоча перадаць аўтар такога пытання. У сваѐй лірыцы Леанід Дранько-Майсюк задае шэраг пытанняў чытачу ці самому сабе, каб лепш зразумець уласны стан. Напрыклад, у вершы «Кнігі і людзі»: «Няўжо я невылечны эгаіст? Няўжо я зусім ваўкаваты маўчун, якому кнігі замяняюць жывых людзей?» [2, с. 19]. Таксама, калі Л. Дранько-Майсюк звяртаецца з пытаннем такога тыпу да аўдыторыі, ѐн уцягвае яе ў дыялог і падштурхоўвае да разважанняў і пэўных высноў: «Праз кожную плошчу, завулак, Кватэры, з якіх не пратураць, – Дзе ж роднаму слову прытулак? Няўжо толькі ў літаратуры?» [2, с. 32]; «А ці многа ў нас цярпення? А ці мудрасці даволі? Рэстаўрацыя сумлення Адбываецца паволі» [2, с. 105]. Трэба адзначыць, што аўтар ужывае ў вершах і адмоўныя рытарычныя пытанні. Нягледзячы на назву, яны фармулююцца без выкарыстання адмоўнай часціцы «не». З іх дапамогай паказваецца немагчымасць падзеі або з‟явы. Напрыклад: «Хіба ж паслухае? Прыпыніцца на хвілю? О, не… ідзе да гэтае мяжы, Яе пераступае ў чорным пыле… Што хоч рабі – крычы, прасі, бяжы!» [2, с. 73]. Як і многія іншыя стылістычныя фігуры, рытарычныя пытанні надаюць мове экспрэсіўнасць і маляўнічасць, набліжаюць яе да жывой эмацыйнай мовы. Таму гэты прыѐм рэгулярна ўжываецца ў самых розных жанрах літаратуры і асабліва выкарыстоўваецца аўтарамі лірычных твораў. Такім чынам, рытарычныя фігуры: воклічы, звароты і пытанні, якія даволі папулярныя ў паэзіі Л. В.Дранько-Майсюка, дазваляюць зрабіць тэкст больш эмацыйным і жывым. Пісьменнік у сваѐй лірыцы выкарыстоўвае такія фігуры, каб узмацніць уражанне чытача, каб стварыць большую выразнасць і жвавасць у сваіх творах. Языкознание 244 Спіс літаратуры 1 Станкевіч, А. А. / Лінгвістычны аналіз

тэксту: вучэбны дапаможнік / А. А. Станкевіч; М-ва адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскі дзярж. ун-т імя Францыска Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2018. – 198 с. 2 Дранько-Майсюк, Л. Вершы, паэмы, эсэ / Л. Дранько-Майсюк. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 214 с. 3 Дранько-Майсюк, Л. Акропаль // Л. Дранько-Майсюк. – Мінск : Маст. літ., 1994. – 190 с. 4 Дранько-Майсюк, Л. / Над пляцам: Вершы / Л. Дранько-Майсюк. – Мінск : Маст. літ., 1986. – 86 с. 5 Хазагеров, Т. Г. Общая риторика: Курс лекций; Словарь риторических приѐмов / Т. Г. Хазагеров, Л. С. Ширина / отв. ред. Е. Н. Ширяев. – 2-е изд., перераб. и доп. – Ростов н/Д : Феникс, 1999. – 320 с. 6 Шандроха, Н. Э. Рыторыка: Тропы і фігуры маўлення / Н. Э. Шандроха. – Гродна : ГрДУ імя Я. Купалы, 2009. – 102 с. 7 Рагойша, В. П. Паэтычны слоўнік / В. П. Рагойша. – Мінск : Выш. школа, 1979. – 320 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ